Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родней мове

# ЗВЯЗДА

20 ЛЮТАГА 2021 г. СУБОТА № 33 (29402)

## ПРЭЗІДЭНТ НАКІРАВАЎСЯ З ВІЗІТАМ У РАСІЮ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваўся з рабочым візітам у Расійскую Федэрацыю, паведамляе прэс-служба беларускага лідара.**

У Сочы 22 лютага адбудуцца перагаворы кіраўніка беларускай дзяржавы з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным. Плануецца, што лідары дзвюх краін падрабязна абмяркуюць шырокі комплекс пытанняў развіцця беларуска-расійскіх адносін, сумеснае рэагаванне на выклікі, у тым ліку ў сферы ваеннай бяспекі, узаемадзеянне ў інтэграцыйных структурах.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін абмяняюцца думкамі па тэматыцы міжнароднага парадку дня.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый МАТУСЕВІЧ, старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці:**

*«Летась на падставе землеўпарадкавальных матэрыялаў мясцовымі і распарадчымі органамі на аўкцыёнах рэалізаваны 1 731 зямельны ўчастак на суму 57,7 мільёна рублёў. Акрамя таго, сфарміраваны 83 зямельныя ўчасткі для размяшчэння аб'ектаў дзяржаўнай нерухомай маёмасці, якія падлягаюць продажу».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

## «Ён не можа быць страчаны, бо гэта здабытак нашага народа»

### Аляксандр Лукашэнка наведаў Купалаўскі тэатр

**Кожны новы сезон Купалаўскі тэатр адкрывае «Паўлінкай» Янкі Купалы. Гэтая пастаноўка з'яўляецца візітнай карткай беларускай драматургіі. Але напярэдадні свайго стагадовага юбілею калектыў тэатра аказаўся ўцягнуты ў палітычныя падзеі поствыбарнага перыяду. Частка трупы звольнілася, спектаклі прыпыніліся... І ўсё ж «Паўлінка» ў Купалаўскім будзе. Гэта стала зразумела, калі тэатр зладзіў кастынг акцёраў для аднаўленай пастаноўкі, распачаліся рэпетыцыі. Учора на рэпетыцыю легендарнага спектакля завітаў кіраўнік дзяржавы. Не абышлося і без шчырай гутаркі з купалаўцамі.**

Міністр культуры Анатоль Маркевіч коратка расказаў Прэзідэнту аб стане спраў ва ўстанове і адраджэнні «Паўлінкі». Ён распавёў, што ў абноўленым спектаклі задзейнічаны акцёры Купалаўскага з ранейшай трупы і студэнты БДУКМ і БДАМ, якія, па словах Анатоля Маркевіча, добра ўліліся ў калектыў. Прэзідэнту паказалі 30-хвілінны фрагмент з 2-га акта «Паўлінкі», спектакль зараз актыўна рэпеціруююць, рыхтуючыся да прэм'еры.

СТАР. 2



Фота БелТА.

## КОРАТКА

- **Прэм'ер-міністр Беларусі Раман Галоўчанка наведаў друкарню ў Бабруйску.**
- «Белавія» пачала ажыццяўляць рэгулярныя рэйсы ў Дубай.
- **Мінсувязі і «Белтэлекам» прэзентавалі мабільную праграму «Мой горад».**
- У Беларусі ў студзені пабудавалі 4,7 тысячы новых кватэр.
- **Новы корпус Брэсцкай дзіцячай абласной бальніцы плануюць увесці ў строй восенню.**
- Мемарыяльную дошку ў гонар унікальнай аперацыі, праведзенай у гады Вялікай Айчыннай вайны, адкрылі на будынку чыгуначнай станцыі Чырвоны Бераг у Жлобінскім раёне.



- **У Беларусі на 1 лютага зарэгістравана на 19 % менш беспрацоўных, чым год таму.**
- Фінал праекта «100 ідэй для Беларусі» адбудзецца 24 лютага.

ISSN 1990 — 763X

21033>

## Па «замкавай» лыжні



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхары і госці Нясвіжа гэтай снежнай зімой маюць магчымасць сумясціць лыжны шпацыр з экскурсіяй па маляўнічых наваколлях старажытнага замка.

З нагоды

## «РОДНАЕ СЛОВА» ЯК НАТХНЕННЕ

**21 лютага ўвесь свет адзначае Дзень роднай мовы. Далучаюцца да яго і беларусы, чый шлях да асэнсавання каштоўнасці свайго моўнага скарбу быў асабліва пакручасты. З нагоды свята наведаемся ў госці да выдання, якое прысвечана мове. Гаворка пра штомесячны навукова-метадычны часопіс «Роднае слова», які заснаваны ў 1987 годзе і ўваходзіць сёння ў склад РУП «Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне»». Не адно пакаленне настаўнікаў, студэнтаў, школьнікаў знаходзіла на яго старонках карысныя парады і натхненне. Менавіта туды дасылалі маладыя філолагі, якія пасля сталі вядомымі навукоўцамі, свае першыя работы — часопіс уключаны ў Пералік навуковых выданняў ВАК Рэспублікі Беларусь для друкавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў.**

СТАР. 8

